# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Беларускі Дзяржаўны Універсітэт 1921

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 24 лютага 2000 года, чацвер, № 3 (1815)


АКЦЫІ

## Экскурсія па БДУ

У студзені гэтага года Саюз жанчын БДУ правёў чарговую акцыю. Для школьнікаў, бацькі якіх з'яўляюцца супрацоўнікамі нашага універсітэта, былі арганізаваны экскурсіі па факультэтах БДУ. Мэта гэтых экскурсій не абмяжоўвалася проста азнаямленнем дзяцей з месцам працы іх бацькоў.

Арганізатары акцыі хацелі паказаць дзецям, што школьная праграма — гэта яшчэ не канчатковыя веды; у руках сённяшніх школьнікаў заўтра, магчыма, будзе знаходзіцца далейшае развіццё навукі. Наша дзяржава вельмі сур'ёзна ставіцца да навуковай сферы, таму дзейнасць у гэтай галіне грамадскага жыцця перспектыўная.

Але гэта — так званая доўгатэрміновая мэта. Для пачатку ж такія экскурсіі скіраваны на прафесійную арыентацыю заўтрашніх студэнтаў.

Першы факультэт, з якім пазнаёміліся дзеці, — геаграфічны. Школьнікі наведалі музей агульнага землязнаўства і музей геаграфіі. Экскурсія атрымалася вельмі цікавай і карыснай. Апавяд пра ўзрост нашай планеты, пра горныя пароды, каштоўныя камяні паказаў, што нават школьнікі, нягледзячы на недахоп часу, імкнуцца пашырыць свой далягляд — зацікаўленасць з іх боку была вялікай. І было ад чаго: ці трымалі вы калі-небудзь у руках кавалак зуба маманта вагою каля шасці кілаграмаў? Калі не — прыходзьце на геафак і ў вас з'явіцца такая магчымасць.

21 студзеня школьнікі знаходзіліся ў сценах хімфака. Яны пабывалі ў электронна-мікраскапічнай лабараторыі, у вучэбнай лабараторыі. Для зацікаўленых хіміяй школьнікаў на факультэце працуе гурток "Юны хімік".

Пасля заканчэння экскурсіі школьнікаў чакаў прыемны сюрпрыз. Ім уручылі падарункі, якія збіралі ўласнымі рукамі нямецкія дзеці: мяккія цацкі, школьныя прылады, прысмакі.

Экскурсіі яшчэ працягваюцца, так што кожны можа далучыцца, каб адчуць, як жыве наша дружная і вельмі добразычлівая універсітэцкая сям'я. Далучайцеся!

*Святлана СІТНІК*

ПРЭЗЕНТАЦЫІ

## ФОНД РАСІЯ–АСЕАН НА БЕЛАРУСІ

*8 лютага гэтага года на базе Беларускага дзяржаўнага універсітэта адбылася прэзентацыя Фонду супрацоўніцтва Расія–АСЕАН.*

Фонд быў створаны ў рамках міжурадавых пагадненняў аб наданні з 1996 года Расіі статуса поўнамаштабнага партнёра АСЕАН (Асацыяцыі дзяржаў Паўднёва-Усходняй Азіі) і займаецца арганізацыяй абмену камерцыйнай і навукова-тэхналагічнай інфармацыяй паміж юрыдычнымі асобамі Расійскай Федэрацыі, СНД і краінамі Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёну (АЦР). Узаемадзеянне з гэтым фондам можа садзейнічаць пашырэнню эканамічных кантактаў прадпрыемстваў і арганізацый Рэспублікі Беларусь з краінамі АЦР, прыцягненню інвестыцый і крэдытаў членаў АСЕАН і АТЭС для фінансавання найбольш эфектыўных праектаў, што рэалізуюцца ў Расійскай Федэрацыі і Рэспубліцы Беларусь.

На прэзентацыі выступілі з дакладамі намеснік дырэктара 2-га Дэпартамента Азіі Міністэрства замежных спраў Расіі А.А. Карчава, генеральны дырэктар Фонду супрацоўніцтва Расія—АСЕАН У.Н. Саутаў і сустаршыня Камітэта па навуцы і тэхналогіях Фонду супрацоўніцтва Расія—АСЕАН, доктар фізіка-матэматычных навук В.М. Чмыроў. У прэзентацыі ўзялі ўдзел прадстаўнікі міністэрстваў і ведамстваў, вядучых навуковых і вытворчых арганізацый Беларусі, зацікаўленых у развіцці супрацоўніцтва з дзяржавамі Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёна.

*Генадзь СТРАЛЬЦОЎ*

КАР'ЕРА

## ДЛЯ БУДУЧЫХ БАНКІРАЎ

19—21 красавіка гэтага года кампанія EMDS Consulting арганізуе ў Маскве чарговы Міжнародны рэкруцінгавы форум "CIS CAREER FUTURES' 2000", які мае сваёй мэтай падбор персаналу для вядучых нацыянальных і міжнародных кампаній і банкаў у Расіі і краінах СНД.

Форум будзе праводзіцца ў форме двухдзённага мерапрыемства, дзе прадстаўнікі буйных міжнародных кампаній сустрэнуцца з лепшымі выпускнікамі і маладымі спецыялістамі, якія пройдуць папярэдне строгі адбор у адпаведнасці з патрабаваннямі кампаній-удзельніц.

Форум — унікальная магчымасць для маладых спецыялістаў прадоўжыць сваю кар'еру ў адной з вядучых кампаній Расіі і краін СНД. Да прыкладу, у расійскіх форумах, арганізаваных Маскоўскім офісам EMDS, пачынаючы з 1997 года ўзялі ўдзел 39 кампаній і 874 кандыдаты. Больш за 50% удзельнікаў атрымалі запрашэнне на работу.

У 2000 годзе EMDS Consulting плануе правесці таксама наступныя форумы:

✓ *27–29 верасня: Career Days IT & Engineering;*

✓ *22–24 лістапада: CIS Career Futures 2000;*

✓ *22–24 лістапада: Career Days Banking & Finance.*

Студэнты апошніх курсаў, выпускнікі і аспіранты для атрымання дадатковай інфармацыі могуць звяртацца ў Маскоўскі офіс EMDS Consulting: Расія, Масква, вул. Усачова, 62/1, тэл. (095) 937 6554, факс (095) 937 6556, e-mail: uni&emds.ru; а таксама ў Цэнтр еўрапейскай дакументацыі і інфармацыі БДУ, які размешчаны па адрасе: праспект Ф. Скарыны, 4, пакой 112, тэл./факс 220-65-38, e-mail: yri@org.bsu.unibel.by

*Уладзімір СТАТКЕВІЧ*

АДУКАЦЫЯ

## На форум у Прагу

Фонд амерыканскай адукацыі запрашае студэнтаў беларускіх ВНУ да ўдзелу ў амерыканскіх семінарах па вывучэнні палітычных і эканамічных сістэм, што пройдуць у сталіцы Чэхіі Празе з 7 па 30 ліпеня 2000 года. У праграме прымуць удзел каля 100 студэнтаў ЗША і 26 краін Еўропы. Форум прысвечаны палітычным і эканамічным сістэмам свету, асобная ўвага будзе ўдзяляцца амерыканскаму вопыту і пераходным працэсам у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе. Удзельнікі будуць забяспечаны добрай стыпендыяй. Ідэальным кандыдатам на ўдзел у форуме будзе студэнт ВНУ з наступнымі характарыстыкамі:

— добрае веданне англійскай мовы, TOEFL 600 і вышэй альбо эквівалент;

— навучэнец трэцяга, чацвёртага, пятага курса альбо выпускнік з добрым атэстатам і характарыстыкай;

— удзел у грамадскім жыцці універсітэта і ўзнагароды за вучобу;

— удзел у іншых адукацыйных праграмах;

— добра напісаныя сачыненні;

— вопыт работы і жыцця ў інтэрнаце.

Апошні дзень рэгістрацыі — 15 сакавіка 2000 года. Каб атрымаць дадатковую інфармацыю альбо падаць заяву на ўдзел у праграме ў рэжыме on-line, звяртайцеся на web-сайт па адрасе: http://www.aipes.org. Калі ў вас узніклі нейкія пытанні альбо вы хочаце атрымаць дадатковыя копіі анкетных формаў, вы можаце звязацца з кіраўніком праграмы Эрыкам Пэрсансам па электроннай пошце — aipes@tfas.org.

Па больш дэталёвую інфармацыю можна звяртацца таксама ў Цэнтр еўрапейскай дакументацыі і інфармацыі БДУ, які размешчаны па адрасе: праспект Ф. Скарыны, 4, пакой 112, тэл./факс 220-65-38, e-mail: yri@org.bsu.unibel.by

*Вольга СЫРЫЧ*

# ЗА ГАЛАВУ СПЕЦЫЯЛІСТА ГРОШЫ ПЛАЦЯЦЬ

У Беларусі апошнім часам набірае абароты рэкруцінгавы бізнес. Толькі ў Мінску на сённяшні дзень існуе каля 10 кадравых агенцтваў. Яны займаюцца тым, што шукаюць высокакваліфікаваных спецыялістаў для асобных фірм і кампаній, якія за гэта плацяць. Як правіла, гэтыя кампаніі дастаткова моцныя і ўстойлівыя і ўжо дараслі да такога ўзроўню, каб укладаць грошы ў свой персанал. Так што для многіх — гэта магчымасць знайсці высокааплачваемую працу без асаблівых намаганняў. Трэба толькі скласці рэзюмэ і адправіць яго ў агенцтва або наведацца туды самому і запоўніць анкету.

У Маскве працуе больш за 300 кадравых агенцтваў. Рэкруцінгавы бізнес там развіваецца хутчэй. І ўмоўна яго можна прадставіць у выглядзе пірамідзы — у залежнасці ад ўзроўню персаналу, які падбіраецца рэкруцёрамі. «Вяршыня» пірамідзы — агенцтва executive search або, як іх яшчэ называюць, «паляўнічыя за галовамі», якія падбіраюць вышэйшых менеджэраў. «Паляўнічыя» лічацца элітай рэкруцінгавага бізнесу. З дапамогай спецыяльных прыёмаў яны пераманьваюць людзей з адной кампаніі ў другую. Навічкам у гэтай нішы рабіць няма чаго — нават старыя агенцтвы, якія працуюць на рынку даўно, рэдка валодаюць тэхналогіяй «палявання» на вышэйшых менеджэраў. Да таго ж кліентаў, якія гатовы плаціць маладому агенцтву за пошук «галоў», знайсці гэтак жа цяжка, як і самі «галовы».

«Сярэдзіна» пірамідзы — агенцтвы, якія займаюцца адборам спецыялістаў на сярэднія пасады ў фірмах. Самыя «прадаваемыя» з такіх спецыялістаў — бухгалтары, рэкламшчыкі, менеджэры па продажы і іншыя (на адбор кожнага з іх ідзе прыкладна месяц). Колькасць кандыдатаў у сярэдзіне «пірамідзы» прыкладна роўная колькасці вакансій. Гэта значыць, што маладое агенцтва ў гэтым сегменце рынку можа знайсці і кандыдатаў, і заказчыкаў. Праўда, менавіта ў гэтай нішы ідзе жорсткая канкурэнцыя агенцтваў, а самыя «тлустыя» кліенты ўжо разабраны. Так што юнаму агенцтву прыходзіцца задавальняцца не самымі дарагімі заказамі.

І нарэшце, «у аснове» пірамід працуюць агенцтвы, якія падбіраюць персанал на ніжэйшыя пазіцыі: «сінія каўняры», сакратары, вадзіцелі і г.д. Праўда, за іх падбор заказчык не плаціць высокіх ганарараў. Затое маладому агенцтву не прыходзіцца траціць шмат часу на пошук кандыдатаў — прапаноў з іх боку дастаткова і на падбор можа пайсці не больш двух тыдняў. За кошт вялікіх абаротаў на «сініх каўнерыках» можна зрабіць нядрэнны бізнес.

Самае разумнае — працаваць у другой і трэцяй нішы. Акрамя таго, ёсць сэнс спецыялізавацца на персанале пэўных прафесійных груп (фінансістах: аудытарах, бухгалтарах і інш.; офісным персанале: сакратарах, офіс-менеджэрах).

Паколькі ў Беларусі рэкруцінгавы рынак не вельмі развіты, многія кадравыя агенцтвы займаюцца сумяшчэннем. Напрыклад, агенцтва «Здесь и сейчас» можа падабраць як сакратара, так і арганізаваць сапраўднае «паляванне за галовамі». Знайсці патрэбнага чалавека вельмі цяжка. Таму, калі ў агенцтве бяруць заказ ад кампаніі, то заўсёды папярэдне ацэньваюць, наколькі рэальна яго выканаць. Справа ў тым, што лепшыя спецыялісты, як правіла, выязджаюць за межы рэспублікі. У большай ступені спецыялізуюцца на кіраўніцкіх вакансіях. Падбіраюць фінансавых і камерцыйных дырэктараў. Але не цураюцца і офісных вакансій. Шукаюць менеджэраў, маркетолагаў, рэкламістаў, праграмістаў і г.д. Апошнім часам вялікі попыт на прадаўцоў у салоны, тавараведаў, кансультантаў, адміністратараў. Патрабуюцца інжынеры-тэхнолагі, вузкія спецыяльнасці.

Заказы выконваюць у асноўным для беларускіх прыватных фірмаў. (Замежныя кампаніі апошні год знізілі сваю актыўнасць.) Тыя, хто звяртаецца ў кадравае агенцтва па дапамогу, добра разумеюць, што сярод знаёмых не заўсёды можна знайсці патрэбнага спецыяліста. Пэўныя цяжкасці ёсць і ў прыватных кампаніях, дзе робяць стаўку на сваякоў, якімі складана кіраваць.

Таму фірмы лічаць за лепшае звярнуцца ў кадравае агенцтва. Бо яно ў стане адабраць па патрабаванні адразу некалькі чалавек, з якімі можна сустрэцца, пагаварыць і спыніць свой выбар на кімсьці адным. Такім чынам, эканоміцца шмат часу і не трэба праводзіць вялікую колькасць субяседаванняў.

Спецыяліст таксама робіць свой выбар. Яго падрабязна знаёмяць з новымі абавязкамі. Ён мае права згадзіцца або адмовіцца. Часцей згаджаюцца. Бо, як адзначалася вышэй, цераз кадравае агенцтва можна ўладкавацца на высокааплачваемую працу. Бывае, чалавек толькі запоўніў анкету — і ўжо працаўладкаваны. Самае вялікае, яму даводзіцца чакаць месяц ці крыху больш.

Добрыя водгукі тых, хто знайшоў працу з дапамогай кадравага агенцтва, — самая лепшая крыніца папаўнення яго базы даных.

У кампаніі «Здесь и сейчас», якая існуе на рынку ўжо даўно (пяць гадоў), асаблівых праблем з базай кандыдатаў няма. Яна складаецца з 11,5 тысячы спецыялістаў. Кожны месяц тут знаходзіцца ў рабоце каля 40 вакансій.

Як паказвае практыка, для запаўнення адной вакансіі кансультант прапускае толькі цераз інтэрв'ю ў сярэднім 15—20 чалавек (прыкладна чатыры ў дзень). Зразумела, патрэбна дасканальна праверыць інфармацыю, якая ўтрымліваецца ў рэзюмэ, а таксама высветліць прафесійныя магчымасці кандыдата. А паколькі адзін—два рэкруцёры не могуць быць кампетэнтнымі ва ўсіх сферах бізнесу, то для ацэнкі кваліфікацыі кандыдатаў час ад часу запрашаюцца кансультанты збоку — юрысты, фінансісты, камп'ютэршчыкі.

Для заказчыка нярэдка даецца гарантыя на падабраны персанал. У большасці агенцтваў тэрмін гарантыі складае некалькі месяцаў. На працягу гэтага часу агенцтва абавязуецца бясплатна замяніць супрацоўніка, калі ён не падыдзе кліенту.

Усё ж кадравыя агенцтвы стараюцца працаваць прафесійна, без памылак. Каб не пайшла дрэнная пагалоска. Агенцтва «Здесь и сейчас», напрыклад, распрацавала сваю ўласную праграму падрыхтоўкі рэкруцёраў. Актыўна супрацоўнічае з расійскімі кадравымі агенцтвамі, з'яўляецца членам расійскай Асацыяцыі кансультантаў па падборы персаналу, членам сеткі «Метраполіс», што дазваляе яму паспяхова функцыянаваць.

*Ганна АНАТОЛЬЕВА*



# КАРЫСНАЕ ПАПАЎНЕННЕ

Аддзелам дыстанцыйнага навучання і новых адукацыйных тэхналогій Цэнтра інфармацыйных тэхналогій у падарунак Фундаментальнай бібліятэцы БДУ перададзены чатырнаццаць кніг па камп'ютэрнай матэматыцы, у тым ліку на англійскай і нямецкай мовах:

✓ Wolfram S. The Mathematica Book. Cambridge, 1996.

✓ Wolfram S. Das Mathematica. Bonn etc, 1997.

✓ Mathematica 3.0. Standard Add-on Packages. Cambridge, 1996.

✓ Getting Started with Mathematica for Students under Microsoft Windows. Version 3.0. Cambridge, 1996 (3 экз).

✓ Gass R. Mathematica for Scientists and Engineers. Using Mathematica to do Science. Upper Saddle River, 1998.

✓ Hermann M.-L. Mathematica: Eine beispielorientierte Einfuhrung. Bonn etc, 1997.

✓ Crandall R.E. Projects in Scientific Computation. New York, 1994.

✓ Maple V. Programming Guide. New York, 1998.

✓ Maple V. Learning Guide. New York, 1998.

✓ Kofler M. Maple V Release 4. Bonn etc, 1996.

✓ Computer Algebra in Fundamental and Applied research and Education. Second International Scientific Conference. Minsk, 1999.

✓ Дьяконов В. П. Справочник по MathCAD PLUS 7.0 PRO. М., 1998.

Многія з названых кніг лічацца аднымі з лепшых у заходніх краінах, а агульны кошт падарунка складае каля 500 долараў ЗША.

Паколькі з літаратуры па камп'ютэрнай матэматыцы беларускаму чытачу даступны толькі лічаныя рускамоўныя выданні, якія не даюць поўнай інфармацыі, папаўненне фонду бібліятэкі БДУ будзе вельмі карысным для студэнтаў, выкладчыкаў і навуковых супрацоўнікаў.

*Вольга СЫРЫЧ*

МЫ І СУСВЕТ

# Егіпет учора і сёння

Егіпет, які геграфічна знаходзіцца ў сярэдзіне арабскага свету, лічыцца цэнтрам яго і ў палітычным, і ў эканамічным, і ў культурным планах. Дзякуючы Суэцкаму каналу, які злучае Міжземнае мора з Чырвоным, ён з'яўляецца мастом, які звязвае Еўропу, Амерыку і Блізкі Усход. Перавышае Егіпет іншыя арабскія краіны і колькасцю насельніцтва, якая дасягае 67 мільёнаў чалавек. Толькі ў Каіры, яго сталіцы, жыве 16 мільёнаў, але гэта не адзіны вялікі горад. Дастаткова вялікія Александрыя — другая сталіца краіны, аль-Фаюм, аль-Мінйа, Луксор, Абу Сімбал, Асуан — гарады, якія захавалі вялікую колькасць помнікаў эпохі фараонаў — адной з буйнейшых цывілізацый, самаму старажытнаму з іх — 4000 гадоў. Егіпет лічыцца музеем пад адкрытым небам, таму што тут знаходзіцца 1/3 гістарычных помнікаў усяго свету.



Егіпет стаяў у цэнтры барацьбы арабаў за незалежнасць, па меншай меры, у войнах арабскіх краін супраць Ізраіля, у якіх нёс вялікія страты, людскія і матэрыяльныя. Аднак пасля падпісання ў 1977 годзе дагавору аб міры з Ізраілем і пачатку перамоў з нагоды вяртання Сіная, якія паспяхова завяршыліся ў 1986 годзе, дастойнае кіраўніцтва краіны на чале з прэзідэнтам Хусні Мубаракам узялося вырашыць цяжкую задачу — аднавіць эканоміку, абраўшы рыначны шлях развіцця. Выкананне гэтай задачы не магло б стаць рэальным без рэфарміравання заканадаўчай асновы, у выніку чаго прыватны капітал атрымаў магчымасць рэалізаваць сябе, а замежны — удзельнічаць у развіцці тых эканамічных галін дзяржсектара, якія мелі патрэбу ў гэтым. Другім крокам на шляху рэфарміравання стала стварэнне прыватным капіталам сучасных



прадпрыемстваў у галіне вытворчасці з замежнымі інвестарамі. Гэта дало станоўчы вынік. Эканамічны ўзлёт адбыўся зусім не дзякуючы мясцовым і замежным прыватным інвестыцыям. Гэта якраз вынік, а фундамент яго — палітычная стабільнасць як ва ўнутранай палітыцы, так і знешняй. Егіпет мае цудоўныя адносіны і з арабскімі краінамі, і з Амерыкай, і з Еўрапейскім Саюзам, і, канешне ж, з Садружнасцю Незалежных Дзяржаў.



Сёння краіна развіваецца хуткімі тэмпамі на ўсіх кірунках: турыстычным, гандлёвым, прамысловым. Вопыт мясцовых дзелавых колаў абагачаецца дзень за днём, таму што ў іх з'явіўся стымул рэфарміраваць і паляпшаць сваю дзейнасць у сувязі з узрастаючай канкурэнцыяй ў сябе і за мяжой.

Егіпет не робіць розніцы паміж Захадам і Усходам. Лепшы прыклад гэтага — падпісанне паміж прэзідэнтамі Егіпта і Беларусі дагавору аб супрацоўніцтве ў галіне эканомікі, гандлю і культуры, што будзе карысным для абедзвюх краін. Асабліва калі ўлічваць іх унікальнае становішча: Егіпта — у арабскім свеце, Беларусі — у СНД. З часам гэтыя адносіны будуць умацоўвацца, дзякуючы палітыцы прэзідэнта Беларусі, які вітае і падтрымлівае такое супрацоўніцтва, як і прэзідэнт Егіпта. Таму ўсё лепшае чакае нас наперадзе.

*Доктар Фехр Махмуд Махамед Шакер,*
*выкладчык Каірскага універсітэта*
*(пераклад з арабскай Эль Фадэля Закарыі,*
*выкладчыка кафедры ўсходніх моў*
*факультэта міжнародных адносін БДУ)*

СПОРТ

# Спартыўнае арыентаванне – гэта выдатна!

Вядома, што з даўніх часоў многія падарожнікі карысталіся схемай, картай, апісаннем, каб дабрацца да пэўнай мэты, гэта значыць карысталіся элементамі арыентавання. Але сам від спорту — арыентаванне — бярэ пачатак з 1897 года, калі ў Нарвегіі былі праведзены першыя спаборніцтвы. У нашай краіне гэта ўпершыню адбылося пад Мінскам у 1961 годзе, а від спорту атрымаў назву спартыўнае арыентаванне.

У БДУ станаўленне арыентавання пачалося з прыходам выкладчыка В.Р. Акімава, а таксама са з'яўленнем у сярэдзіне 70-х гадоў вялікай групы актыўных, вясёлых, жыццялюбівых студэнтаў, якія стварылі секцыю арыентавання ў БДУ, вядомую не толькі ў Мінску. Вясёлае правядзенне часу, арганізацыя сістэматычных трэніровак і выездаў "на карту", разбор "палётаў" пасля спаборніцтваў і многае іншае стала жыццём і працай секцыі. Найбольш вядомыя фігуры — Андрэй Мялешка, Георгій Жызнеўскі, Іван Бяспалаў, Адам Шпакоўскі, Святлана Атамановіч, Людміла Чыж. Пачынаючы свае заняткі арыентаваннем з нуля, яны не толькі выканалі разрад кандыдата ў майстры спорту, але і ўвайшлі ў склад зборных каманд рэспублікі, выйгралі не адны спаборніцтвы. У той перыяд пачалі праводзіцца першынствы універсітэта, якія першыя тры гады выйграваў Андрэй Мялешка.

Значны ўклад у развіццё арыентавання ва універсітэце і рэспубліцы ўнёс выкладчык Станіслаў Фёдаравіч Рыжанкоў, які прыйшоў на кафедру фізічнай культуры і спорту ў канцы 70-х. Яго вучні і дзіцячыя турысцкія арганізацыі горада ў лістападзе мінулага года правялі першыя спаборніцтвы "Надзея", прысвечаныя яго памяці. Пераможцамі па групе М18 сталі студэнты факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ Аляксей Цітовіч і Андрэй Кубаркоў.

Работа па арыентаванні ва універсітэце працягваецца. На кафедры фізічнай культуры і спорту праводзяцца заняткі ў групе спартыўнага арыентавання, створаны клуб арыентавання БДУ, які ў канцы студзеня быў прыняты ў Беларускую федэрацыю арыентавання. Наперадзе ў спартсменаў цікавы і захапляльны сезон: плануюцца старты ў Мінску, Гродна, Бабруйску, Магілёве. Асноўнае мерапрыемства года — гэта правядзенне XXVII першынства універсітэта, якое адбудзецца 11 мая, а таксама ўдзел у спартакіядзе ВНУ Рэспублікі Беларусь 25—27 мая.

Сур'ёзна рыхтуюцца да асноўных стартаў сезона майстар спорту Таццяна Васкабойнікава (геаграфічны факультэт), кандыдат у майстры спорту Аляксей Тамашаў (фізічны факультэт), першаразраднік Пётр Кухто (факультэт радыёфізікі і электронікі).

Арыентаванне — гэта выдатна. Гэта гульня з картай і компасам па лесе: хто хутчэй адшукае КП — загадкавы чырвона-белы аб'ект. Арыентаванне даступна кожнаму, хто любіць лес, падарожжы, рэбусы, гульні. Арыентаванне дапаможа прагнаць усе хваробы, навучыць хутка прымаць рашэнні ў любых абставінах, весела бавіць час.

Запрашаем хлопцаў і дзяўчат на заняткі па арыентаванні.

Месца сустрэчы па пятніцах з 18.00 у спорткомплексе БДУ каля ўвахода ў басейн. Альбо можна званіць па пятніцах, аўторках і чацвяргах па тэлефоне 262-54-20. Трэнер-выкладчык Віктар Віктаравіч Красільнікаў.

*Надзея КРАСІЛЬНІКАВА,*
*член клуба арыентавання БДУ,*
*студэнтка НІПП*

ВЫ ЧУЛІ?

# АДКРЫЦЬ НЕВЯДОМАЕ

Мы часта марым пра падарожжы, кожнаму з нас цікава пабачыць далёкія і блізкія краіны, унікальныя славутасці культурнай і прыроднай спадчыны.

І ўявіце сабе, што гэтую мару сёння вельмі проста можна ажыццявіць, пры гэтым не толькі самому глядзець шырока адкрытымі вачыма на выдатныя помнікі прыроды і культуры, але і паказваць іх іншым, дапамагаць ім адкрыць невядомае, якое на першы позірк здавалася такім знаёмым.

Вы на гэта здольныя. Вас чакае **Вышэйшая школа экскурсаводаў і менеджэраў турызму Беларускага дзяржаўнага універсітэта.** Студэнты старэйшых курсаў, працягваючы навучанне па сваёй спецыяльнасці, могуць паралельна атрымаць прафесію менеджэра турызму, экскурсавода, кіраўніка турыстычнай групы, што ў будучым дасць ім права і магчымасць на поўную альбо частковую занятасць у турыстычнай сферы.

Наш адрас: г. Мінск, вул. Ленінградская, 12 (геаграфічны факультэт), пакоі 223, 224. Даведкі па тэлефоне 220-78-93.

*У адным з апошніх нумароў "Беларускага універсітэта" мы паведамлялі пра адкрыццё ў дворыку універсітэцкага гарадка скульптуры беларускай асветніцы Еўфрасінні Полацкай. Цяпер крыху зазірнем у гісторыю і раскажам пра жыццё і справы нашай знакамітай суайчынніцы.*

# НЯБЕСНАЯ АПЯКУНКА

Дзяўчынцы, якая нарадзілася ў сям'і князя Святаслава-Георгія і княгіні Сафіі, далі старажытнае полацкае імя Прадслава. Так звалі яшчэ бабку гордай Рагнеды.

Калі ў княжаскім цераме спраўлялі радзіны, невядома. Па адных звестках — каля 1120 года, па другіх — 1110, але абедзве даты вельмі прыблізныя.

У той час дзяцінства было карацей, чым зараз. Мінавала княжацкай дачцы 12 гадоў — час збірацца замуж. Тым больш, што пра розум і прыгажосць Прадславы ведалі далёка за сценамі Полацка. Многія сваталіся да князёўны, але ёй ніхто не падабаўся. І колькі яе ні ўгаворваў бацька, князёўна заставалася ў дзеўках. І бацька з маці вырашылі нарэшце выдаць Прадславу за сына нейкага багатага валадара. Але яны яшчэ не ведалі, што іх дачка выбрала для сябе іншы шлях.

Прадслава пайшла ў манастыр і пад імем Еўфрасінні ўпотайкі ад бацькоў прыняла пострыг, каб прысвяціць сваё жыццё духоўнаму ўдасканаленню. Беларускі даследчык



Еўфрасіння Полацкая

"Жыція" Аляксей Мельнікаў лічыць, што гэта верагодней за ўсё было 25 верасня, у дзень святой Еўфрасінні Александрыйскай.

Князь Святаслаў ірваў на галаве валасы, а княгіня Сафія галасіла па дачцэ, як па нябожчыцы. Гэта было першае і вельмі цяжкае выпрабаванне юнай Хрыстовай нявесты.

Маладая манашка магла поўнасцю прысвяціць сябе кнігам. Акрамя Бібліі яна чытала рымскіх і візантыйскіх багасловаў, якіх называюць бацькамі царквы.

Пражыўшы некалькі гадоў у манастырскай слабодцы, князёўна — каб быць бліжэй да бібліятэкі — папрасіла ў полацкага епіскапа Іллі дазволу пасяліцца ў Сафійскім саборы. Там, у келі-галубніцы, як гаворыць "Жыціе", яна "нача книгы писати своими руками".

"Жыціе" апавядае, што аднойчы ў сне анёл узяў Еўфрасінню за руку і адвёў за дзве вярсты ад горада ў Сяльцо, дзе на беразе Палоты стаяла драўляная царква Спаса і мураваны храм-пахавальня полацкіх епіскапаў. На гэтым месцы нябесны госць прамовіў: "Тут належыць быць табе!" Сон паўтарыўся тры разы. У тую ж ноч падобны сон бачыў полацкі епіскап: анёл наказаў яму ўвесці рабу Божую Еўфрасінню ў Спасаўскую царкоўку.

Запрасіўшы дзядзьку Еўфрасінні полацкага князя Барыса, яе бацьку Святаслава і знакамітых палачан, епіскап Ілля абвясціў чарніцы, што аддае ёй Сяльцо. Тая, памаліўшыся ў Сафійскім саборы і ўзяўшы з сабою адну манахіню, пайшла на месца, якое ёй паказаў анёл.

У Сяльцы Еўфрасіння заснавала жаночы манастыр. Гэта было яшчэ пры жыцці Барыса Усяславіча, значыць, не пазней 1128 года, калі той памёр. Хутка пры новай царкве Багародзіцы ўнучка Усяслава Чарадзея стварае яшчэ адзін манастыр — мужчынскі. Гэта яшчэ адзін подзвіг: тады, у пачатку XII стагоддзя, манастыроў было вельмі мала.

У манастырах Еўфрасіння адчыніла майстэрні па перапісванні кніг. Адзін майстар рабіў тут каляровыя ініцыялы, другі — мініяцюры, трэці — пераплёты. Калі была патрэба перапісваць кнігу хутчэй, яе дзялілі на некалькі частак.

Пры манастырах былі адкрыты і школы. Але Еўфрасіння пашырыла рамкі звычайнай праграмы. Акрамя царкоўнаславянскай, юныя палачане вывучалі грэчаскую і лацінскую мовы, атрымлівалі веды па прыродазнаўстве і медыцыне, рыторыцы. Вялікая ўвага надавалася гісторыі. Вучні павінны былі ведаць радаслоўную полацкай дынастыі, буйнейшыя падзеі з мінулага Полацкай зямлі і ўсяго ўсходняга славянства.

Памочніцамі і падтрымкай Еўфрасінні былі яе сёстры: родная Гардзіслава (у манастве Еўдакія) і стрыечная Звеніслава (Еўпраксія).

Але трапілі яны ў манастырскія сцены па-рознаму.

Маладая ігумення папрасіла бацьку прысланць да яе малодшую сястру ў навучанне грамаце, а потым тайна пастрыгла яе ў манахіні. Бацька прыехаў у Сяльцо, горка плачучы, абдымаючы Гардзіславу і ніяк не жадаючы ўжо другую дачку аддаваць Богу. "Жыціе" захавала словы князя, якія сведчаць пра глыбіню яго адчаю: "Дзеці мае! Ці для гэтага нарадзіў я вас, ці для гэтага выхоўвала вас маці ваша? Дзеля чаго шлюб вам рыхтаваў? Няўжо і шлюбныя ўборы ператворацца ў гора маё?" Знайшоўшы шлях да сэрца сястры, асветніца здолела суцешыць Божым словам і бацькоў.

Звеніслава прыйшла да сястры сама.

Сёстры заставаліся разам ўсё далейшае жыццё. Еўпраксію асветніца абрала ў спадарожніцы, выпраўляючыся пад канец свайго зямнога шляху ў Іерусалім. Роднай сястры Еўдакіі, пакідаючы Полацк, яна даручыла "ўладарыць і кіраваць абодвума манастырамі". Пазней тая, відаць, заняла месца ігуменні і працягвала справу сваёй настаўніцы.

Перад ад'ездам у Святую Зямлю Еўфрасіння насуперак волі бацькоў зрабіла Хрыстовымі нявестамі дачок свайго любімага брата Вячаслава — Вольгу і Кірыяну. Не трэба вінаваціць Еўфрасінню ў бессардэчнасці. Такіх учынкаў патрабавала ад полацкай ігуменні турбота аб будучым яе пачынання. "Жыціе" сцвярджае, што князёўна мела ад Бога дар: зірнуўшы на кагосьці, адразу ўбачыць, ці ёсць у ім дабрадзейны дух і ці можа гэты чалавек быць абраннікам Хрыстовым.

Полацкае княства паспяхова адстойвала незалежнасць ад Кіева. Акрамя палітычных і эканамічных выгод, гэта давала творчую свабоду дойлідам, жывапісцам, ювелірам, ад якіх ніхто не патрабаваў абавязковай арыентацыі на кіеўскія ўзоры. Полацкая зямля — гэта не толькі прарадзіма беларусаў, але і калыска беларускай культуры. Еўфрасіння была адной з выхавацельніц гэтага "дзіцяці". Увесь час збіраючы вакол сябе таленты, яна стала нашай першай мецэнаткай.

Высокі ўзлёт полацкай школы дойлідства засведчыла стварэнне Спасаўскай, альбо Спаса-Прэабражэнскай (зараз яе часта не зусім правільна называюць Спаса-Еўфрасіннеўскай) царквы — неацэннага помніка сусветнай культуры.

Гэты храм быў створаны Іаанам — палацкім манахам, які кіраваў арцеллю муляраў. Гэта быў геніяльны дойлід. Ён ужо будаваў цэрквы. І вось Іаан стварае зусім іншы, не падобны на мінулыя, храм.

Згодна з "Жыціем", дойлід не аднойчы чуў на досвідку таямнічы голас, што клікаў яго будаваць сабор у гонар Спаса — Хрыста Збавіцеля. «І аднойчы падняўся ён, і прыйшоў да Еўфрасінні, і сказаў ёй: "Ці не ты, маці, пасылаеш за мною?" А яна адказала: "Не". Але падумаўшы, гаворыць яму блажэнная гэта жанчына: "Нават калі і не я цябе абуджаю, усё роўна паслухай з чыстым сэрцам і ўвагай таго, хто кліча цябе..." Пасля гэтага пабудавала Еўфрасіння царкву мураваную святога Спаса, і ішла будова на працягу трыццаці тыдняў».

Поруч з імёнамі Еўфрасінні і дойліда Іаана заўсёды згадваецца імя Лазара Богшы. Магчыма, у яго ювелірнай майстэрні юная Прадслава выбірала сабе ўпрыгожванні, асцярожна дакраналася да маленькіх тыгляў, разглядвала эмальныя іконкі. Стаўшы ігуменняй, яна заказала знакамітаму майстру крыжкаўчэг для захавання дасланых з Царграда і Іерусаліма хрысціянскіх святыняў. Такі важны заказ ювелір павінен быў выконваць пад наглядам ігуменні, якая, мабыць, была аўтарам эскіза святыні і вялікага надпісу на ёй.

Свой шэдэўр Богша стварыў у 1161 годзе. Крыж шасціканцовы. Яго форма сімвалізуе Сусвет, створаны Богам, як вядома, за шэсць дзён. Аснова крыжа — кіпарысавае дрэва, з якога выраблялі асабліва важныя культавыя прадметы.

Рэліквія мела вышыню каля 52 сантыметраў, даўжыня верхняй папярэчкі — 14, ніжняй — 21, таўшчыня — 2,5 см. Зверху і знізу дрэва было пакрыта дваццаць адной залатой пласцінкай з каштоўнымі камянямі, арнаментамі і дваццаццю эмальнымі мініяцюрамі.

У сярэдзіне крыжа ў пяці квадратных надпісаных гнёздах знаходзіліся рэліквіі — кавалачак крыжа Гасподняга з кроплямі крыві Ісуса, драбок каменя ад труны Багародзіцы, часткі мошчаў святых Стэфана і Панцеляймона, а таксама кроў святога Дзімітрыя.

Крыж Еўфрасінні — адначасова і каштоўны помнік старажытнабеларускага пісьменства. Кароткі надпіс каля мошчаў святога Панцеляй-

мона паведамляе нам імя майстра: "Господи, помози рабоу своемоу Лазорю, нареченному Богъши, съделавъшемоу крьстъ сии цьркви святаго Спаса и Офросиньи". На пазалочаных пласцінках існуе вялікі тэкст з цікавымі гістарычнымі звесткамі. На беларускую мову ён перакладаецца так: "У лета 6669 (паводле сучаснага летазлічэння, 1161. — У.А.) кладзе Еўфрасіння святы крыж у сваім манастыры, у царкве святога Спаса. Дрэва святое бясцэннае, акова ж яго золата і срэбра, і камяні, і перлы на 100 грыўняў, а да... (пропуск) 40 грыўняў. І хай не выносяць яго з манастыра ніколі, і не прадаюць, не аддаюць. Калі ж не паслухаецца хто і вынясе з манастыра, хай не дапаможа яму святы крыж ні ў жыцці гэтым, ні ў будучым, хай пракляты будзе ён святой жыватворнаю Тройцаю ды святымі айцамі 300 і 50 (?) сямі сабораў святых айцоў і хай напаткае яго доля Іуды, які прадаў Хрыста. Хто ж насмеліцца ўчыніць такое... валадар або князь, або епіскап ці ігумення, або іншы які чалавек, хай будзе на ім гэты праклён. Еўфрасіння ж, раба Хрыстова, што справіла гэты крыж, здабудзе вечнае жыццё з усімі святымі..."

...У 1921 годзе крыж святой Еўфрасінні рэквізавалі бальшавікі. З-пад апекі духавенфрасінні знаходзіцца ў міжнародным пошуку, зарэгістраваны Інтэрполам пад нумарам 34-1130. Была нават спроба выкарыстаць у пошуку крыжа вядомых экстрасэнсаў. Трое з іх, у тым ліку і сусветна знакамітая балгарка Ванга, упэўнены, што крыж раней ці пазней будзе знойдзены.

А пакуль што вядомы мастак-ювелір з Брэста Мікола Кузьміч з благаслаўлення царкоўных улад зрабіў копію крыжа святой Еўфрасінні Полацкай, каб людзі ўсвядомілі, што мы згубілі, і каб уявілі цяжкі шлях стварэння рэліквіі.

...Ігумення Еўфрасіння ніколі не губляла сувязей са знешнім светам, была для землякоў настаўніцай і суддзёй. Падчас высылкі Рагвалодавічаў у Візантыю ўнучка Усяслава заставалася, магчыма, адзінай прадстаўніцай полацкай дынастыі на радзіме. Укрыўшыся за манастырскімі сценамі, яна была своеасаблівым сцягам барацьбы палачан за незалежнасць.

У гісторыка-археалагічным запаведніку ў Ноўгарадзе можна ўбачыць пячатку Еўфрасінні, знойдзеную там на Рурыкавым гарадзішчы. Пячатка пацвярджае вялікую ролю князёўны-ігуменні ў палітычным жыцці княства. Праз веча яна ўплывала на запрашэнне

# ЗЯМЛІ БЕЛАРУСКАЙ

ства ён трапіў пад чорнае крыло АДПУ. Пазней крыж знайшлі ў мясцовым фінаддзеле і перавезлі ў Менск. Аднак наступ на беларускую культуру працягваўся. "Чыстка" ішла не толькі ў грамадстве, але і ў музейных сховішчах. Нацыянальныя скарбы вывозілі ў Расію альбо проста знішчалі. Злачынства напачатку здзяйснялася пад відам эвакуацыі каштоўнасцей далей ад дзяржаўнай мяжы. Страх перад "інтэрвенцыяй міжнароднай буржуазіі" нарадзіў ідэю пераносу сталіцы БССР у Магілёў, куды пачалі пераводзіць рэспубліканскія ўстановы. У 1929 годзе туды трапіў і крыж



*Крыж Еўфрасінні Полацкай*

Еўфрасінні Полацкай. У час нямецкай акупацыі рэліквія раптоўна знікла. Цяперашняе яе месцазнаходжанне невядома. Даследчыкамі выпрацавана шмат версій, у тым ліку і тая, што крыж знаходзіцца ў калекцыі мільянера Моргана ў Нью-Йорку. Да гэтага часу крыж Еўу Полацк князёў і прызначэнне епіскапаў, кандыдатуры якіх павінен быў зацвердзіць агульны сход гараджан. Са згоды Еўфрасінні ў 1132 годзе жыхары Полацка выгналі кіеўскага стаўленіка і абвясцілі сваім князем роднага брата ігуменні: «Полочане же рекше: "лишаемся нас" и выгнаша Святополка, а Василка посадиша Святославича».

Еўфрасіння заўсёды прымала нягоды роднай зямлі блізка да сэрца. У "Жыцці" гаворыцца, што яна не хацела нікога бачыць ворагамі: "ни князя со князем, ни бояри с боярином, ни служанина со служанином — но всех хотяше имети, яко едину душю". Князёўна-ігумення дапамагла Усяславу ІІ спыніць спрэчкі Рагвалодавічаў. У канцы яго княжання шэсць полацкіх князёў разам хадзілі на Друцк і выгналі адтуль смаленскага стаўленіка.

...На схіле жыцця Еўфрасіння вырашыла здзейсніць духоўны подзвіг паломніцтва ў Святую Зямлю. Брат Вячаслаў з іншымі роднымі і ўсе палачане сабраліся ў Спасаўскім манастыры і прасілі ігуменню не пакідаць іх, але тая яшчэ раз паказала свой рашучы характар. "Не кінуць вас хачу, а памаліцца за сябе і за вас", — сказала яна землякам на развітанне.

У тыя часы ў далёкія вандраванні, каб пазбегчы бездарожжа, выпраўляліся звычайна на пачатку зімы альбо раннім летам. Выехаўшы з Полацка адразу пасля Калядаў, увесну можна было дабрацца да Візантыі. Адсвяткаваўшы Нараджэнне Хрыстова, адправіліся ў дарогу і полацкія паломнікі.

Еўфрасінню суправаджалі яе стрыечная сястра Еўпраксія і брат Давыд. Спачатку падарожнікі, мабыць, ехалі на санях, а потым часткова сушаю, часткова вадою, пераадольваючы за дзень 30-40 вёрст. Паўсюль ва ўсходнеславянскіх княствах знакамітую палачанку чакаў гасцінны прыём. На сваім шляху яна сустрэлася з імператарам Мануілам Комнінам, які ішоў вайною на венграў. Кесар прыняў сваячку вельмі прыязна. Паломнікі наведалі сабор святой Сафіі, набылі залатое кадзіла, каштоўныя фіміямы і іншыя неабходныя ў Святой Зямлі рэчы і атрымаўшы ад патрыярха благаслаўленне, паехалі далей.

Сустрэча Еўфрасінні з імператарам Мануілам ставіць пад сумненне агульнапрынятую дату паломніцтва і смерці святой (1173). Гэты



*Спасаўская царква, узведзеная за 30 тыдняў Іаанам*

візантыйскі кесар апошні раз хадзіў вайною на венграў у 1167 годзе, прычым выйшаў у паход на Вялікдзень, 8 красавіка. Прыкладна ў той самы час яго дзяржавы дасягнулі і полацкія паломнікі. Пляменніц Еўфрасінні Вольгу і Кірыяну перад ад'ездам ігуменні пастрыгаў у манастыр уладыка Дзіянісій, які стаў полацкім епіскапам пасля 1166 года. На падставе гэтых фактаў годам смерці святой Еўфрасінні можна лічыць 1167-ы.

У канцы красавіка ігумення і яе спадарожнікі падыйшлі да іерусалімскіх муроў. Еўфрасіння паслала свайго слугу Міхаіла да патрыярха прасіць, каб ёй адчынілі браму, праз якую калісьці ўвайшоў у горад Ісус Хрыстос. Цяжкасцей з дазволам не ўзнікла. Іерусалім належыў крыжаносцам, а валадарыў у ім кароль Амальрых І. Ён таксама быў полацкай князёўне сваяком — праз жонку французскага караля Генрыха І Ганну, якая была дачкою Яраслава Мудрага і ўнучкай Рагнеды Рагвалодаўны.

Еўфрасіння шчыра малілася і кадзіла з залатой кадзільніцы дарагімі фіміямамі каля труны Гасподняй. Пасяліўшыся ў манастыры Святой Багародзіцы, падзвіжніца прыходзіла да труны тры дні запар. На трэці дзень яна пакінула там кадзільніцу з іншымі залатымі дарункамі і звярнулася да Усявышняга з малітваю, каб дазволіў ёй памерці ў Святым горадзе, дзе адбылося збаўленне роду чалавечага.

У хуткім часе Еўфрасіння захварэла. Яна ўжо не магла сама хадзіць да ракі Іардан, дзе хрысціўся Сын Божы, і паслала туды брата з сястрой і слуг. Тыя прынеслі князёўне іарданскай вады, і паломніца, падняўшыся з ложка, напілася і акрапіла сябе ёю, а потым зноў лягла, просячы Госпада хутчэй узяць да сябе яе душу.

"Жыццё" расказвае, што да Еўфрасінні быў пасланы анёл, які паведаміў, што малітвы яе пачутыя і на нябёсах ужо чакаюць сустрэчы з ёю. На дваццаць чацвёрты дзень хваробы яна адчула хуткі скон, паклікала святара і, паспавядаўшыся і прыняўшы прычасце, аддала сваю душу Усявышняму.

Зямное жыццё асветніцы завяршылася. "Давыд же и Евпраксия и с прочими спряташа тело ея честно". Пахаваўшы Еўфрасінню у Феадосіевым манастыры Святой Багародзіцы ў Іерусаліме, паломнікі павезлі сумную вестку ў Полацк.

*Паводле кнігі Уладзіміра Арлова "Таямніцы полацкай гісторыі" падрыхтавала Вольга КУЛІКОВА*

# АДРАСЫ БАЗ ДАНЫХ ЕЎРАПЕЙСКАГА САЮЗА

*Цэнтр еўрапейскай дакументацыі і інфармацыі Белдзяржуніверсітэта прапануе чытачам "Беларускага універсітэта" пазнаёміцца з камп'ютэрнымі адрасамі баз даных Еўрапейскага Саюза. Думаецца, што гэтая інфармацыя будзе карыснай і студэнтам, і супрацоўнікам нашага універсітэта. У артыкуле даецца кароткая характарыстыка той інфармацыі, якую вы можаце адшукаць па пэўным адрасе.*

**APC (Monitoring the decision-making process — Назіранне за працэсам прыняцця рашэнняў).** APC утрымлівае ўсе міжінстытуцыйныя працэдуры, пачатыя адсылкай дакументаў Еўрапейскай Камісіі ў Савет альбо іншыя структуры, а таксама афіцыйныя і ўсе іншыя дакументы, якія накіроўваюцца ў Еўрапейскі Парламент. **Адрас — http://eur-op.eu.int/en/general/s-ad.htm**

**CELEX (Communitatis Europeae Lex — Заканадаўства Еўрапейскай Супольнасці).** CELEX утрымлівае поўныя тэксты заканадаўчых актаў, якія ляжаць у аснове дагавораў, рашэнні інстытуцый ЕС і кансультатыўных органаў, судовыя справы Еўрапейскага Суда Справядлівасці і Суда ў першай інстанцыі. **Адрас — http://europa.eu.int/celex**

**COMEXT.** База даных утрымлівае статыстычную інфармацыю аб знешнім гандлі Еўрапейскага Саюза, а таксама гандлі паміж краінамі-членамі.

**CORDIS (Community Research and Development information Service — Інфармацыйнае абслугоўванне даследчых работ у Еўрапейскай Супольнасці).** База даных з'яўляецца крыніцай інфармацыі для розных устаноў: даследчых інстытутаў, прамысловых прадпрыемстваў, малых фірм, універсітэтаў, якія жадаюць прыняць удзел у даследчых праграмах, заснаваных ЕС, быць у курсе апошніх навін аб даследаваннях і распрацоўках, знайсці партнёра для сумесных даследчых работ. **Адрас — http://www.cordis.lu**

**ECLAS (European Commission Library automated system** — Аўтаматызаваная сістэма бібліятэкі Еўрапейскай Камісіі). **Адрас — http://europa.eu.int/eclas**

**EPOQUE (European Parliament on-line query — Інтэрактыўны запыт Еўрапейскага Парламента).** База даных утрымлівае дакументацыю аб усіх накірунках работы Еўрапейскага Парламента, а таксама аб дзейнасці яго членаў. **Адрас — e-mail: hdepoque@europarl.eu.int**

**EUDOR (European Union document delivery service on the WEB — Сетка распаўсюджання дакументаў Еўрапейскага Саюза).** EUDOR — сховішча дакументаў ЕС, форма прадастаўлення інфармацыі аб афіцыйных публікацыях інстытуцый ЕС. **Адрас — http://eudor.eur-op.eu.int**

**EUR-Lex** — бясплатная форма інфармацыйнага абслугоўвання з мэтай забеспячэння адкрытасці законаў Еўрапейскага Саюза для шырокіх колаў грамадскасці. **Адрас — http://europa.eu.int/ eur-lex**

**EURO-Ombudsman (Multilingual WEB server of the European Ombudsman — Шматмоўны сервер сеткі Еўрапейскага Амбудсмана).** База даных дапамагае грамадзянам ЕС у карыстанні інфармацыяй аб рабоце Амбудсмана, мэта дзейнасці якога — даследаванні і даклады ў розныя інстанцыі аб выпадках парушэнняў у органах і структурах ЕС. **Адрас — http://www.euro-ombudsman.eu.int**

**EUROPA (The European Union on the infomation highway — Інфармацыя аб Еўрапейскім Саюзе).** Найбольш поўная база даных пра ўсе аспекты Еўрапейскай інтэграцыі. **Адрас — http://europa.eu.int**

**EUROPARL (European Parliament multilingual WEB server — Шматмоўны WEB-сервер Еўрапейскага Парламента).** Разам з серверам EUROPA Еўрапейскай Камісіі гэты сервер распаўсюджвае інфармацыю аб рабоце Парламента, інстытуцый ЕС для спецыялістаў, даследчыкаў і шырокіх колаў насельніцтва. **Адрас — http://www.europarl.eu.int**

**IDEA (Interinstitutional directory of European administration — Міжінстытуцыйны даведнік Еўрапейскай Адміністрацыі).** База даных дазваляе карыстальніку звярнуцца да канкрэтнага служачага з нагоды прадастаўлення інфармацыі адносна пэўнага накірунку палітыкі Еўрасаюза. **Адрас — http://europa.eu.int/idea/ideaen.html**

**I*Forum (Directory of service and Consultants — Даведнік па паслугах і кансультацыях).** База даных інфармуе аб кампаніях і юрыдычных асобах, якія прадастаўляюць паслугі і кансультацыі ў галіне інтэрфейсаў, комплекснага адлюстравання інфармацыі, універсальных носьбітаў інфармацыі, электроннай пошты, кампакт-дыскаў і т. п. **Адрас — http://www.echo.lu**

**I*m Guide (Information market guide — Даведнік па рынку сродкаў інфармацыі).** База даных створана, каб дапамагчы карыстальнікам інфармацыі арыентавацца ў прадукцыі і паслугах, якія прапаноўвае Еўрапейскі рынак інфармацыйных паслуг. **Адрас — http://www.echo.lu/im-guide**

**NEW Cronos (Macroeconomic statistical database — База даных па макраэканамічнай статыстыцы).** База даных утрымлівае больш за 100 мільёнаў статыстычных даных, якія характарызуюць эканамічны стан і ўмовы жыцця ў краінах-членах, а таксама даныя пра ЗША, Японію, краіны Цэнтральнай Еўропы і краіны, якія з'яўляюцца галоўнымі эканамічнымі партнёрамі ЕС.

**OIL (The weekly Oil Bulletin on-line — Штотыднёвы бюлетэнь "Нафта").** Бюлетэнь інфармуе аб цэнах на бензапрадукты, якія пастаўляюцца ў краіны-члены, аналізуе цэны ў розных краінах, асвятляе практыку нафтавых рынкаў.

**PROSOMA (Turning innovation into business — Навацыі ў бізнесе).** База даных створана для падтрымкі праграмы інфармацыйных тэхналогій ESPRIT, забяспечвае комплекснае адлюстраванне інфармацыі аб сучасных еўрапейскіх інавацыях. **Адрас — http://www. prosoma.lu**

**RAPID (Daily European Union news briefings — Кароткі агляд навін для ЕС).** База даных утрымлівае прэс-рэлізы, дакладныя запіскі Савета Міністраў, Камітэта па эканамічных і сацыяльных пытаннях і Камітэта рэгіёнаў, Суда Справядлівасці, Дэкларацыі ЕС і т. п. **Адрас — http://europa.eu.int/en/comm/spp/rapid.html**

**REGIO (Regional statistics — Статыстыка рэгіёнаў).** База даных прадастаўляе інфармацыю пра ўсе бакі эканамічнага і сацыяльнага жыцця рэгіёнаў, дае магчымасць асвятляць даныя адносна краін-членаў ЕС. **Адрас — http://eur-op.eu.int/en/general/s-ad.htm**

**REM (Radioactivity environmental monitoring — Назіранне за радыеактыўнасцю навакольнага асяроддзя).** База даных утрымлівае вынікі назіранняў за станам радыеактыўнасці навакольнага асяроддзя ў краінах-членах пасля Чарнобыльскай аварыі з улікам абавязацельстваў краін-членаў па Дамове Еўрапейскай Супольнасці па ядзернай энергетыцы. **Адрас — http://java.ei.jrc.it**

**SCADPlus (Practical information for European citizens — Практычная інфармацыя для грамадзян Еўропы).** У базе даных прапануецца канспектыўны пераказ артыкулаў з перыядычных выданняў усяго свету адносна ЕС. Прадастаўленая інфармацыя можа быць карыснай для служачых (прафесіяналаў усіх узроўняў), выкладчыкаў і студэнтаў, а таксама усіх, хто цікавіцца справамі Еўрапейскага Саюза. **Адрас — http://europa.eu.int/scadplus**

**Sesame (Energy technology research projects — Даследчыя праекты энергетычных тэхналогій).** База назапашвае апісанні даследаванняў, тэхналагічных, тэхнічных праектаў у энергетычным сектары. **Адрас — http://europ.eu.int/en/general/s-ad/htm**

**TED (Tenders electronic daily — Штотыднёвая інфармацыя аб тэндэрах).** База даных прапануе тэндэры на дзяржаўныя (грамадскія) работы і кантракты на пастаўкі не толькі дзяржаў-членаў ЕС, а таксама з Афрыкі, краін басейна Карыбскага мора і Ціхага акіяна, краін, якія маюць асацыіраванае членства у ЕС і тых, якія яго не маюць (Японія, ЗША). **Адрас — http://ted.eur-op.eu.int**

Больш падрабязную інфармацыю пра адрасы баз даных Еўрапейскага Саюза можна атрымаць у Цэнтры еўрапейскай дакументацыі і інфармацыі БДУ, які знаходзіцца па адрасе:

праспект Ф. Скарыны, 4, пакой 112,
тэл./факс (375)(17)220-65-38,
e-mail:yri@org.bsu.unibel.by

# ЭЛЕКТРОННЫЯ ПАДРУЧНІКІ НОВАГА ПАКАЛЕННЯ

Таму, хто хаця б у малой ступені мае дачыненне да камп'ютэрнага свету, добра вядома катэгорыя праграмных прадуктаў пад назвай "электронныя падручнікі". Сёння ўжо ёсць даволі багаты асартымент такіх праграм. Іх змест накіраваны на выказванне некаторых звестак з той альбо іншай галіны ведаў з задачамі, якія дадаюцца, для самастойнага рашэння і/альбо тэстамі для ацэнкі атрыманых ведаў. Адрасаваны падобныя падручнікі, як правіла, школьнікам, але сустракаюцца і распрацоўкі па асобных фрагментах універсітэцкіх курсаў.

Хаця дыяпазон якасці гэтых праграм вельмі вялікі — ад простых тэстаў (дзесятак пытанняў з чатырма варыянтамі адказаў на кожны) да вельмі ўнушальных распрацовак, арыентаваных на Інтэрнэт, — усе яны маюць адну агульную ўласцівасць: яны... статычныя. Паспрабую растлумачыць сваю думку. Гэтыя падручнікі не могуць быць мадыфікаваны самім карыстальнікам (псаванне праграмы няўмелым узломшчыкам не ўлічваецца). У іх не прадугледжана магчымасць карэкціроўкі і дапаўнення вывучаемага матэрыялу. А што датычыцца задач, то пасля трох-чатырох паўторных сеансаў навучэнец зможа выбраць правільнае рашэнне і націснуць на патрэбную кнопку проста па памяці, а не карыстаючыся атрыманымі ведамі. Вяршыня "творчай фантазіі" такой праграмы — гэта выбар варыянта задачы з паўсотні нарыхтовак выпадковым чынам.

Для стварэння электронных падручнікаў выкарыстоўваюцца самыя разнастайныя сродкі ад простага стопрацэнтнага праграмавання на Паскалі альбо Сі да html-дакументаў, якія ўжываюць самыя сучасныя тэхналогіі. Аднак чамусьці да апошняга часу ў нашай краіне ніхто сур'ёзна не звяртаў увагу на асаблівую групу праграм, якія хутка развіваюцца і ўжо даюць магчымасці не толькі высокапрафесійнага выкарыстання па сваім "прамым" прызначэнні, але таксама выходзяць на вядучыя ролі ў афармленні афіцыйных дакументаў, навуковых прац, прэзентацый і (тут ужо нікуды не дзецца!) стварэнні праграм адукацыйнага зместу. Гаворка ідзе пра такія праграмы, як *Mathematica*, Maple, MuPAD і т. п. — пра сістэмы камп'ютэрнай матэматыкі. Традыцыйная назва гэтых прагмам "Сістэмы камп'ютэрнай алгебры" ужо не зусім адэкватна адлюстроўвае іх магчымасці.

Інфармацыя пра сістэмы камп'ютэрнай матэматыкі перыядычна з'яўлялася на старонках "Беларускага універсітэта", і многія публікацыі на гэтую тэму былі прысвечаны сістэме *Mathematica*. Яно і зразумела: за апошні год з выхадам чацвёртай версіі *Mathematica* зрабіла значна больш крокаў да звання лідэра ў гэтым класе праграм, чым яе асноўны канкурэнт Maple. Прычым распрацоўшчыкі *Mathematica* — Wolfram Research, Inc. (WRI), ЗША — дадаткова інтрыгуюць карыстальнікаў, заяўляючы, што чацвёртая версія сістэмы з'яўляецца толькі "прахадной" і наступная версія будзе якасна адрознівацца ад цяперашняй.

Аб перавагах і недахопах вылічальных магчымасцей Maple і *Mathematica* можна спрачацца і, зусім верагодна, некаму па-ранейшаму імпануюць лікавыя вылічэнні і рашэнне дыферэнцыяльных ураўненняў у Maple. Аднак у частцы інтэрфейса, на маю думку, *Mathematica* даўно пайшла наперад і менавіта па гэтай прычыне дадзеная сістэма з'яўляецца (ізноў-такі на мой суб'ектыўны погляд) найбольш прыдатнай для стварэння прынцыпова новых электронных падручнікаў.

Кажу "прынцыпова новых" і не лічу гэта перабольшаннем. Пры захаванні ўсіх магчымасцей існуючых падручнікаў (камбінацыя ў адным платформна-незалежным дакуменце тэксту, табліц, імпарціраванай графікі і анімацыі, арганізацыя дыялогу з карыстальнікам, гіпертэкставыя спасылкі і інш.) з'яўляецца галоўнае — магчымасць непасрэднага выканання ўсіх вылічэнняў унутры падручніка. Вылічэнняў — у шырокім сэнсе слова: *Mathematica* дазваляе працаваць з сабой і як з калькулятарам (лічбавым і сімвальным), і як з магутнай сістэмай праграмавання, якая дазваляе будаваць і аналізаваць складаныя матэматычныя мадэлі.

*Mathematica* — вялікі праграмны прадукт, на поўнае вывучэнне якога можна затраціць не адзін год, і таму пры выкарыстанні яго толькі ў якасці базы для падручніка наўрад ці значная частка яго патэнцыялу застанецца невыкарыстанай. Але і той часткай магчымасцей сістэмы, якая будзе выкарыстоўвацца, неабходна валодаць дастаткова свабодна. І, хаця авалоданне ідэямі мовы і яе сінтаксісу не выклікае асаблівай цяжкасці, а сам падручнік можа быць пабудаваны такім чынам, што засваенне сістэмы будзе ісці паралельна з вывучэннем прадмета, усё ж думаецца, што найбольш падыходзячымі чытачамі (альбо карыстальнікамі) падобных падручнікаў былі б студэнты. Аднак зусім адмаўляць у падобных дапаможніках сярэдняй школе таксама не трэба.

Каб у чытача не склалася ўражанне, што ўсё вышэйсказанае не больш, чым захапляльная ідэя, якая завалодала не ў меру ўражлівым розумам, пяройдзем да фактаў.

Па-першае, для многіх, спадзяюся, не сакрэт, што электронныя дакументы на базе розных сістэм камп'ютэрнай матэматыкі (не толькі *Mathematica*) з поспехам і даволі даўно выкарыстоўваюцца ў адукацыйных мэтах многімі замежнымі універсітэтамі. Больш таго, і ў Беларусі асобныя энтузіясты выкарыстоўваюць падобныя напрацоўкі і маюць у гэтым ужо адносна салідны вопыт.

Па-другое, у Беларускім дзяржаўным універсітэце ўпершыню зроблена праца па афармленні ў выглядзе набору дакументаў *Mathematica* цэльнага курса для канкрэтнай навучальнай установы. Поўны курс вышэйшай матэматыкі для Пінскага банкаўскага каледжа быў створаны ў Цэнтры інфармацыйных тэхналогій БДУ групай супрацоўнікаў пад кіраўніцтвам загадчыка аддзела дыстанцыйнага навучання і новых адукацыйных тэхналогій Ю.В. Пазняка фармальна на паўтары месяцы раней, чым кампанія Wolfram Research абвясціла аб з'яўленні сваіх распрацовак аналагічнага маштабу. Яшчэ адзін курс "Дзелавыя вылічэнні" створаны крыху пазней і служыць цудоўным пацвярджэннем таму, што падобныя распрацоўкі магчымы не толькі для чыста матэматычных дысцыплін.

Аднак варта адзначыць, што ў БДУ з *Mathematica* працуюць легальна, у адрозненне ад значнай большасці карыстальнікаў гэтай сістэмы ў Беларусі. У 1999 годзе БДУ набыў 30 ліцэнзійных копій праграмы, а таксама атрымаў правы афіцыйнага распаўсюджвальніка прадукцыі WRI на тэрыторыі Беларусі. Пры гэтым супрацоўнікамі Цэнтра інфармацыйных тэхналогій БДУ была зроблена вялікая праца, дзякуючы якой WRI распрацавала спецыяльную праграму грантаў для Беларусі і значна знізіла цэны на *Mathematica*. Так, пры кошце адной копіі *Mathematica* ў 1050 долараў ЗША любыя дзяржаўныя навукова-даследчыя інстытуты, а таксама любыя адукацыйныя установы Беларусі (альбо аб'яднанне такіх) могуць набыць 100 копій за 2800 долараў ЗША. Аналагічная праграма грантаў з нядаўняга часу працуе і ў Расіі. Разам з самой сістэмай прапануецца таксама мноства (а дакладней трыццаць восем) спецыялізаваных пакетаў, якія пашыраюць магчымасці *Mathematica* у асобных галінах ведаў (Mechanical Systems, Finance Essentials, Fuzzy Logic, Optica і інш), але гэта — падстава для асобнай гутаркі.

І яшчэ на тэму выкарыстання легальнага праграмнага забеспячэння ў Беларусі. Па даных WRI на верасень 1999 года налічвалася зарэгістраваных карыстальнікаў *Mathematica*: у Расіі — 282, Украіне — 69, у Беларусі ...ніводнага. Ёсць пра што падумаць?

Але вернемся да электронных падручнікаў. На II Міжнароднай канферэнцыі па камп'ютэрнай алгебры CAS-99, якая праходзіла ў БДУ у верасні мінулага года, падручнік па вышэйшай матэматыцы на базе *Mathematica* быў упершыню шырока прадэманстраваны і атрымаў высокую ацэнку з боку такіх удзельнікаў, як У. Гердт, У. Дзяканаў (Расія), А. Марычаў (ЗША). Удзельнік з Германіі Р. Краглер, які мае вялікі вопыт у выкладанні з выкарыстаннем *Mathematica*, прызнаў, што падобных распрацовак да гэтага часу не сустракаў і выказаў зацікаўленасць у стварэнні аналагічнага падручніка на нямецкай і англійскай мовах.

Акрамя стварэння падручнікаў, Цэнтр інфармацыйных тэхналогій БДУ таксама даследуе іншыя аспекты выкарыстання матэматычнага праграмнага забеспячэння ў адукацыі. З лютага 1999 года ў навучальных класах БДУ праводзяцца курсы для старшакласнікаў па вывучэнні школьнай матэматыкі з актыўным выкарыстаннем сістэм камп'ютэрнай матэматыкі. Такім чынам, паралельна з вывучэннем алгебры і геаметрыі навучэнцы могуць пазнаёміцца з сучаснымі камп'ютэрнымі тэхналогіямі. Для больш старэйшых зацікаўленых асоб супрацоўнікамі Цэнтра чытаецца курс па навучанні рабоце з сістэмай *Mathematica*.

Акрамя WRI, ніводная з заходніх кампаній-стваральнікаў сістэм камп'ютэрнай матэматыкі пакуль не ідзе насустрач карыстальнікам СНД. Гэта азначае, што калі ў бліжэйшы час у нашай краіне пачнуць на справе рэалізоўваць дэкларацыі аб барацьбе з пірацкім праграмным забеспячэннем, то *Mathematica* зойме пануючае становішча на беларускім рынку. Хаця, могуць і не пачаць...

*Сяргей ЗЯМСКОЎ, загадчык сектара камп'ютэрных сродкаў навучання ЦІТ БДУ*

ВЫСТАВЫ

# ПАНЯМОННЕ ЯЎГЕНА КАЗЮЛІ

“Калі ўзняцца над прынёманскімі лугамі і лясамі, то ўбачыш, як доўгай, звілістай стужкай, падобнай на дарогу, працягнуўся да гарызонту Нёман. Гэта і ёсць НЁМАНСКІ ШЛЯХ, якім я і прапаную шаноўным гледачам прайсці разам. Каб разам убачыць прыгажосць Панямоння, зазірнуць у вочы працавітым і добрым людзям. І яшчэ —





каб разам адчуць горыч і сорам за тое, што не захоўваем належным чынам нашу гістарычную і культурную спадчыну.

Добрага Вам падарожжа па НЁМАНСКАМУ ШЛЯХУ”.

Такімі словамі прафесіянальны фатограф з дваццацігадовым стажам Яўген Казюля прадставіў сваю выставу мастацкіх фатаграфій, адкрыццё якой адбылося 14 лютага ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры. Выстава з шасцідзесяці высокаякасных фатаграфій будзе дзейнічаць на працягу месяца.

Гэта трэцяя персанальная выстава Яўгена Казюлі. Былі яшчэ “Вытокі” і “Браслаўшчына”, а таксама сумесная з польскімі і нямецкімі фатографамі выстава пад назвай “Час цішыні”. Большую частку матэрыялаў для сваіх выстаў аўтар рыхтуе падчас вандровак на веласіпедзе. Яго фатаграфіі можна часта бачыць на старонках газет — Яўген Карпавіч працуе фотакарэспандэнтам у газеце “Голас Радзімы” і Беларускім інфармацыйным агенцтве БелТА.

Праект выставы “Нёманскі шлях” падтрымала Міністэрства культуры Беларусі, прызначыўшы Яўгену Казюлі Дзяржаўную стыпендыю 1999 года.

*Уладзімір МІХАЙЛАЎ*

НЕ ПРАПУСЦІЦЕ!

## *Мой малюнак — натхненне*

Клуб аўтарскай песні БДУ праводзіць вялікі канцэрт у ДК Трактарнага завода 23 сакавіка пад назвай “Мой малюнак — натхненне”. Вы пачуеце песні ў выкананні А. Нежаўца, С. Саскаўца, Г. Калдуна, сясцёр Мінскіх, братоў Юцкевічаў, П. Калінкава і інш.

А 6 і 7 красавіка будзе праводзіцца другі агульнауніверсітэцкі конкурс акцёраў і выканаўцаў паэтычнай песні “First-A-2000”. Заяўкі на ўдзел неабходна падаць да 21 сакавіка ў Дырэкцыю па справах культуры БДУ. Тэл. 220-42-07 (з 29 лютага званіць па новым нумары 206-58-91).

## *Прыгажуні, спяшайцеся!*

Вы маладая і абаяльная, прыгожая і чароўная — тады гэта для вас.

10 сакавіка ў 16 гадзін у актавай зале галоўнага корпуса БДУ адбудзецца першы тур шоу конкурсу “Міс БДУ—2000”.

Запрашаюцца ўсе жадаючыя дзяўчаты. Параметры і рост значэння не маюць. Пры сабе неабходна мець туфлі на высокіх абцасах, фотаздымкі, а таксама быць у адзенні, якое падкрэслівае фігуру.

Канкурсантак чакае тры туры, заключны плануецца прыкладна на 26 красавіка.

Чакаем вас!

## *Конкурс музычнай пародыі*

Упершыню ў БДУ 28 сакавіка праводзіцца адкрыты агульнауніверсітэцкі конкурс музычнай пародыі. Усе жадаючыя прыняць у ім удзел павінны паказаць музычныя нумары, створаныя па матывах сучасных поп- і рок-шлягераў, класічных твораў, і любыя пародыі на артыстаў эстрады, кіно, вядомых шоу-мэнаў. Заяўкі на ўдзел у конкурсе падаваць у Дырэкцыю па справах культуры да 20 сакавіка. Тэл. 220-42-07 (з 29 лютага званіць па новым нумары 206-58-91).

*Ксенія МАСАЛЁВА, студэнтка факультэта журналістыкі*

## *Новая праграма “Нейра-дзюбель”*

17 сакавіка ў 19.00 у клубе “Магна” (вул. Кульман, 14) адбудзецца канцэрт вядомага сучаснага гурта “Нейра-дзюбель”, на якім будзе прадстаўлена новая праграма. Кошт білета 2,5 тысячы рублёў. Спяшайцеся набыць білеты загадзя, таму што ў дзень канцэрта яны будуць каштаваць даражэй. Даведкі і заказ білетаў па тэлефоне 274-94-47.

*Мікалай ВАСІЛЕЎСКІ*

ДЛЯ ЦЯБЕ

## У 2000 год з новай модай

Прыйшоў 2000 год, які прынёс з сабой новую моду, стыль, тэндэнцыі. А таксама конкурс-фестываль “Мадэль года — 2000”. Гэты фестываль адбыўся 8 лютага ў Беларускім дзяржаўным цырку пад эгідай Упраўлення бытавога абслугоўвання насельніцтва Мінгарвыканкама. Да конкурсу вялася вельмі доўгая падрыхтоўка: выбіраліся лепшыя калекцыі адзення, мадэлі з найбольш вядомых агенцтваў Мінска. У конкурсе-фестывалі былі прадстаўлены калекцыі ў намінацыях: “Камфорт”, “Кар’ера”, “Адпачынак і забава”, “Без межаў” і “Асаблівы выпадак”. Гэта быў своеасаблівы конкурс мадэльераў Мінска. А лепшыя калекцыі будуць прымаць удзел у наступным конкурсе “Супер-мадэль Беларусі”, які адбудзецца ў сакавіку. Узнагародай у ім будуць “Залатыя нажніцы”, якія атрымаюць лепшыя мадэльеры.

Мадэлі адзення былі вельмі цікавыя. Яны прыцягвалі сваёй непаўторнасцю, арыгінальнасцю. Уся зала была поўная. А вяла гэты фестываль Алена Спірыдовіч. Мадэлі паказалі прыгожае дэфіле. І яшчэ адзін цікавы факт. У гэтым мерапрыемстве прымалі ўдзел і манекеншчыцы з БДУ, якіх падрыхтаваў Саша Варламаў.

*Ксенія МАСАЛЁВА, студэнтка факультэта журналістыкі, удзельніца конкурсу “Мадэль года – 2000”*


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Заснавальнік газеты — БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.

Газета надрукавана ў Выдавецкім цэнтры Белдзяржуніверсітэта 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Ум. друк. арк. 1

Падпісана да друку ў 12.00

24 лютага

Зак. 98.

Т. 1000 экз.

Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 2206827.

Рэдактар Т. М. КАЗАК

Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Камп’ютэрная вёрстка Вольгі Сырыч